УДК [124.43+17.023.36]:930.85(476)"18"

*У. А. ЖЫЛКО*

# УВАСАБЛЕННЕ ДАМІНУЮЧЫХ ГРАМАДСКІХ ІДЭАЛАЎ У ТВОРЧАСЦІ СУБ'ЕКТАЎ РАМАНТЫЧНАЙ КУЛЬТУРНАЙ ПАРАДЫГМЫ

*Даследаванне грунтуецца на адной з найбольш прынцыповых культуралагічных катэгорый – катэгорыі ідэалу. Аўтар засяроджвае ўвагу на грамадскіх ідэалах XIX ст., падкрэсліваючы адмысловасць дадзенай катэгорыі як адной з вызначальных светапоглядных арыентацый суб'ектаў беларускай рамантычнай культурнай парадыгмы. Праз зварот да разгляду асаблівасцей беларускай сацыякультурнай сітуацыі XIX ст. аўтарам абгрунтавана асноўная накіраванасць увасобленых у літаратурных тэкстах грамадскіх ідэалаў як арыенціраў і ўзораў для рэфармавання і ўдасканалення грамадскага ладу.*

Чалавечая прырода прадугледжвае імкненне да ідэалу, якое знаходзіць сваё адлюстраванне ў культуры. Творчыя суб'екты культуры асэнсоўваюць жыццё з розных бакоў, спецыялізуючыся на адначасовым вывучэнні шматлікіх праблем. Менавіта таму аб'екты духоўнай культуры пераўтвараюцца ў эфектыўныя інструменты самапазнання ўсёй культуры. Сярод такіх аб'ектаў вызначальнае месца займае ідэал.

Пад катэгорыяй ідэалу разумеюць духоўнае адлюстраванне пэўных норм, узораў, якія адрозніваюцца ад паўсядзённай рэчаіснасці, валодаюць пабуджальнай сілай да дзеяння, служаць арыенцірам у дзейнасці.

Культурфіласофскаму разуменню ідэалу, яго ролі ў культуры, у структуры духоўнасці суб'екта прысвечаны шматлікія даследаванні ў айчыннай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

філасофіі і культуралогіі: М. Крукоўскі [5], У. Рагуля [9], Л. Уладыкоўская [11]. Аднак адсутнічае даследаванне, у якім выяўляюцца грамадскія ідэалы той ці іншай эпохі на матэрыяле літаратурных тэкстаў. На наш погляд, неабходна даследаваць ідэальны змест і напаўненне нацыянальнай гісторыі і культуры, у прыватнасці феномен беларускага рамантызму XIX ст. Пераадоленне вузкаспецыфічнага, літаратуразнаўчага падыходу да беларускай літаратуры і культуры XIX ст. у значнай ступені абумовіла актуальнасць навуковых пошукаў.

*Мэтай* дадзенага *артыкула* з'яўляецца выяўленне адметнасцей увасаблення дамінуючых грамадскіх ідэалаў у творчасці суб'ектаў рамантычнай культурнай парадыгмы сацыякультурнага развіцця беларускага грамадства XIX ст. (на матэрыяле беларускай літаратуры).

Азначэнне паняцця культурнай парадыгмы было сінтэзавана намі з канцэпцый Т. Куна [6], Н. Бакач [2], Н. Петрачэнка [8] і заключаецца ў разуменні пад дадзенай культуралагічнай катэгорыяй феномена цэласнасці сацыякультурных адзінак у іх стылявой сінхроннасці, у аснове якога інтэгратыўны прынцып, істотны для культуры, разгледжанай на гарызантальным зрэзе, аднолькава прадстаўленага ва ўсіх «адначасовых» феноменах сацыякультурнай рэчаіснасці, і ў адносінах да якога дадзеныя з'явы могуць быць растлумачаны як моманты адзінай культурнай цэласнасці [2, с. 9]. Культурная парадыгма ўяўляе сабой «паняційную сетку», у якой кадзіруюцца інтэлектуальны ўзровень, сістэма мыслення, эмацыянальны стан, сістэма каштоўнасцей чалавека, эпохі, спосаб пастаноўкі і вырашэння ім сэнсажыццёвых задач. Кожная грамадска-гістарычная эпоха выпрацоўвае ўласную, характэрную толькі ёй парадыгму. Мэтазгоднасць разгляду рамантызму ў якасці культурнай парадыгмы абумоўлена адметнасцю дадзенага сацыякультурнага феномена, а менавіта тым, што рамантызм адначасова можа разглядацца і аналізавацца як гісторыка-культурная эпоха, літаратурны кірунак, мастацкі стыль і як інтэлектуальная фармацыя, паколькі аксіялогія рамантызму вызначае мастацтва і стыль паводзін, адзення, а таксама іншых аспектаў жыццядзейнасці. У рамках рамантычнай культурнай парадыгмы выпрацоўваецца свая каштоўнасна-іерархічная сістэма, тып маральнай свядомасці і паводзін, а таксама ацэначных структур, якія выступаюць агульнымі арыенцірамі для яе суб'екта і прымаюць удзел у фарміраванні яго культурнага аблічча, індывідуальнага стылю жыцця. Сярод іх вызначальнае месца адведзена грамадскім ідэалам.

Паўнацэннае існаванне грамадства немагчыма без грамадскіх ідэалаў, паколькі менавіта яны выконваюць сацыярэгулятыўную функцыю. Найбольш глыбокае ўсведамленне грамадскага ідэалу ў якасці ўяўлення пра ідэальны грамадскі лад адбываецца праз мастацтва як сродак аб'ектывацыі. Дзякуючы мастацкім вобразам, грамадскі ідэал набывае сваю нагляднасць і канкрэтнасць [1, с. 13]. Мастацкі твор аказвае пэўнае ўздзеянне на грамадска-псіхалагічныя з'явы. Дзякуючы сваім спецыфічным механізмам, мастацтва можа калі не падказаць чалавеку і грамадству выйсце з крызісу, так дапамагчы.

Кожны этап гістарычнага развіцця культуры мае сваю спецыфіку, свой «твар», праз які адлюстроўваюцца праблемы мэты і сэнсу чалавечага існавання. Ідэалы канкрэтна гістарычныя і культурна абумоўленыя. Яны фар-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

міруюцца элітай у адказ на пэўныя запыты і чаканні грамадства і ўвасабляюцца ў філасофскіх або мастацкіх праектах. Неабходна падкрэсліць, што ў XIX ст. ва ўмовах імперскага кантролю за любымі праявамі грамадскай думкі нацыянальная рэфлексіўная філасофія культуры не магла развівацца ў форме тэарэтычнага мыслення – яна выражалася ў літаратурных мастацкіх алюзіях. Менавіта праз алюзіі магчыма выявіць дамінуючыя грамадскія ідэалы таго часу.

У працэсе фармулявання новага грамадскага ідэалу часта пераасэнсоўваецца суаднясенне ідэалаў сучаснага з культурай мінулага часу, а нярэдка само мінулае падказвае сучаснасці ідэал або непасрэдна выступае ў яго ролі. Менавіта ідэал мінуўшчыны займае адно з вызначальных месцаў у межах рамантычнага парадыгмальнага светапогляду. Дадзеная сэнсавая дамінанта лягла ў аснову творчасці прадстаўнікоў беларускай рамантычнай традыцыі. Адным са шляхоў удасканалення грамадскага ладу імі бачылася арыентацыя на мінулае як узор у дзейнасці і жыцці. Ідэал адыгрываў функцыю пэўнага сацыяльнага матыватару, які накіроўваў грамадскую актыўнасць і думку ў бок вырашэння актуальных для таго часу задач. Увогуле перыяд XIX ст. пазначаны высокай духоўнай актыўнасцю суб’екта культуры і актуалізацыяй каштоўнасцей мінулых часоў. У першай палове XIX ст. пачынаецца працэс усведамлення беларусамі свайго мінулага, што было абумоўлена актывізацыяй нацыянальнай думкі. Насуперак пашыранаму ў тагачасных навуковых колах тэзісу аб безаблічнасці, бясслаўнасці мінулага беларусаў і іх гістарычнай пасіўнасці назіраецца ідэалізацыя мінуўшчыны ў межах рамантычнай парадыгмы сацыякультурнага развіцця, што яскрава выяўляецца ў творчасці суб’ектаў дадзенай парадыгмы. Праз мастацкую творчасць рэпрэзентавана адчуванне самастойнасці не проста гістарычнага шляху, але і духоўнай спадчыны беларусаў.

Зварот да мінулага найперш абумоўлены такой рамантычнай дамінантай, як «двухсветавасць» – супрацьпастаўленне рэальнага і ўяўнага свету. Рэчаіснасць з яе ўтылітарнасцю і бездухоўнасцю адмаўляецца суб’ектамі рамантызму, замест яе сцвярджаецца ўяўны, ідэальны «іншасвет». У якасці такога ідэальнага свету, адлюстраванага ў творчасці прадстаўнікоў рамантычнай традыцыі, выступае мінулае, як далёкае, так і блізкае, як уяўнае, сімвалічнае, так і гістарычна дакладнае.

Творчай канцэпцыі Яна Баршчэўскага ўласціва ідэалізацыя маладосці як найбольш яскравага і бесклапотнага перыяду жыцця: «Калі малады, зямля – рай, усюды дзівосы» [3, с. 137]. Ідэал мінулага лірычнага героя ўвасоблены ў архетыпе раю, абумоўлены не толькі інтымнымі перажываннямі, звязанымі з юнацтвам, паколькі агульнавядома, што суб’ект нараджае сэнсы, абапіраючыся на ўласны культурны вопыт, але атаясамліваецца Я. Баршчэўскім з аксіялагемай Радзімы, роднага краю, дзе прайшлі маладыя гады, і тым самым выходзіць за межы свядомасці суб’екта, пераадольваючы першапачатковую абмежаванасць зместу, набывае значнасць у межах нацыянальнай грамадскай супольнасці: «Край, дзе чалавек жыў у шчаслівую пару сваёй маладосці, <…> заўсёды паўстае ў найпрыгажэйшых колерах; там, здаецца, яшчэ не скончыўся той залаты век, калі чалавек не разумеў, што такое нядоля і пакуты, і рэчкі там з малака і мёду» [3, с. 136].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Я. Чачот таксама ідэалізуе сваю маладосць: «Зноў вярнуць вякі б нам тыя, / Калі рэкамі ліліся / Малако, мяды густыя, / Людзі соладка жылі ўсе. / Сэрцы ў іх былі – бы з мёду, / Чысціні малочнай – душы. / Чорных дзён не зналі з роду, / Смутак дум іх не цярушыў» [13, с. 28].

У такой ідэалізацыі мінулага можна ўгледзець архетып «залатога веку» як найбольш набліжаны час існавання гарманічнага грамадства. Ідэал «залатога веку» ў большасці прадстаўнікоў беларускага рамантызму ўзыходзіць да дакладных гістарычных перыядаў найвышэйшага росквіту ў адносна недалёкім мінулым роднага краю.

Спробы ідэалізацыі тэмпаральна канкрэтнага гістарычнага перыяду прасочваюцца ў «Спевах пра даўніх ліцвінаў да 1434 года» Я. Чачота. У прадмове аўтар сцвярджае, што кожны народ «шукае ў попеле мінуўшчыны сваю славу, свае асаблівасці, даказвае, што і ён заслугоўвае пашаны з боку іншых» [13, с. 126]. Такім чынам, у дадзеным зборніку пісьменнік паспрабаваў адлюстраваць у якасці ідэальнага акрэслены па часе гістарычны перыяд існавання Вялікага Княства Літоўскага, які лічыцца найбольш паспяховым у сэнсе эканамічнага і культурнага развіцця беларускага грамадства: «Пазайздросцілі Літве ўсе, / Што жыве шчасліва» [13, с. 127].

Ё. Хёйзінга ў артыкуле «Пра гістарычныя жыццёвыя ідэалы» падкрэсліў значнасць памяці пра сапраўднае мінулае, паколькі менавіта пры дакладнай інтэрпрэтацыі гістарычны змест ідэалу ўзрастае і ён становіцца больш вызначаным і акрэсленым [12, с. 274]. Я. Чачот пры дапамозе ўзгадвання гістарычных персанажаў, ідэалізацыі іх дзеянняў і ўчынкаў адлюстроўвае веліч і грамадскую дасканаласць мінулай эпохі. Выразна паўстаюць вобразы Гедыміна, Альгерда, Радзівіла: «Хто пустэльняй край свой зробіць, / Той не варты згадкі. / Хто ж яго ўзвысіць, будуць / Помніць і нашчадкі» [13, с. 141].

Па меркаванні Ё. Хёйзінгі, калі на ідэал дасканалага шчасця пачынаюць пазіраць як на незваротна страчаны, узнікае патрэба жыць, імкнучыся і прытрымліваючыся менавіта гэтага ідэалу [12, с. 275].

Шчырае імкненне вярнуць мінулае ў А. Міцкевіча непасрэдным чынам звязана з імкненнем вярнуць страчаную дзяржаўнасць, што было прадыктавана тагачасным збегам гістарычных абставін, надзвычай неспрыяльных для Беларусі (тагачасная тэрыторыя краіны апынулася пад уладай Расійскай імперыі, тым самым быў распачаты чарговы перыяд дээтнізацыі). У вяртанні дзяржаўнасці бачылася адраджэнне народа, яго былой славы і моцы: «Успамінаюць. Хто з вас не заплакаў / Ад радасці – бач, помняць нашу славу?! / А вернем славу – вернем і дзяржаву, / Бо з парастка пачатак дрэва волі» [7, с. 26]. Менавіта таму ў творчасці паэта пастаянна гучыць матыў вяртання.

У якасці грамадскага ідэалу для суб'ектаў рамантычнага светапогляду ў межах беларускай сацыякультурнай сітуацыі выступае вечны пошук дому, страчанай Радзімы, з чым відавочна цесна знітаваны ідэал мінуўшчыны. Так, для рамантычнай творчасці У. Сыракомлі характэрна пераасэнсаванне пошукаў Радзімы, вечнага вяртання як арыенціра для дзейнасці, што абумоўлівае яго культуратворчасць: «Добра тут была? / Цяпер не знаю, Чы не заплачу па згубе? / Чы прыляцеўшы вясной з выраю, /



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гняздо застану на дубе? / < … > Так пажурыўшысь думкаю шчырай / Бусел, узняўшысь паволі, / Паплыў па небе кудысь на вырай / Шукаць і шчасця і долі» [10, с. 40–41].

Такім чынам, ідэал мінуўшчыны, які з'яўляецца адным з дамінуючых аб'ектаў духоўнай культуры ў творчай спадчыне прадстаўнікоў беларускага рамантызму, нягледзячы на сканструяванасць з дасягненняў мінулага, якія пазнаюцца і каштоўнасна асэнсоўваюцца творцамі, валодае пэўнай перспектывай, бо падказвае, як чалавеку і грамадскай супольнасці трэба жыць і на што арыентавацца ў жыцці.

Паколькі чалавек – істота гістарычная, якая ўсведамляе сваю канечнасць, з аднаго боку, і прыналежнасць да гісторыі, дачыненне да мінулага і будучыні – з другога, стварэнне вобраза будучыні з'яўляецца яго неад'емнай патрэбай. Пры распрацоўцы мадэлі ідэальнай будучыні суб'екты рамантычнай парадыгмы арыентаваліся на каштоўнасныя складнікі грамадскага ідэалу, улічваючы гістарычныя абставіны той эпохі.

Разуменне творчасці суб'екта культуры немагчыма без пранікнення ва ўнутраны свет пісьменніка, што ажыццяўлялася пры дапамозе фенаменалагічнай рэдукцыі інтэнцыянальнага аналізу свядомасці, распрацаванай Э. Гусэрлем. Вучоны сцвярждаў, што для творцы паўстае не свет у цэлым або асобныя яго часткі, а сэнс свету. І гэты свет канстатаваны ў адпаведнасці з пэўным модусам перажывання, тыпам яго інтэнцыі ці накіраванасці на прадмет. Так, у А. Міцкевіча ў якасці дамінуючага складніка ідэалу будучыні выступае ідэальная катэгорыя свабоды. Адсутныя ці абмежаваныя магчымасці сацыяльнага дзеяння з'яўляліся прычынай фарміравання ў індывідуальнай і супольнай суб'ектыўнай свядомасці ідэалу свабоды. Істотна зазначыць, што свабода ёсць маральная катэгорыя. Яе адлюстраванне ў канкрэтных каштоўнасцях залежыць ад маралі і ўзроўню культуры грамадства. У філасофскім сэнсе, свабода – гэта магчымасць вечнага развіцця да ідэалу.

Свабода выступае ў ролі грамадскага ідэалу, паколькі з'яўляецца натуральнай мэтай імкненняў кожнага народа, што вызначае этычныя прынцыпы паводзін асобы і акрэслівае рамкі публічнай дзейнасці пэўнага грамадства. Гэта таксама паказчык узроўню цывілізацыі народаў, крытэрый месца сярод культур, на якім у гістарычным працэсе знаходзіцца народ.

Трэба ўлічваць тагачасную актуальнасць патрэбы ў свабодзе, абумоўленую сацыякультурнай сітуацыяй. Ідэал свабоды ў грамадскім сэнсе В. Каратынскі ўсведамляў як магчымасць мець Радзіму, якая ў сувязі з апошнімі палітычнымі падзеямі была страчаная і да якой можна вяртацца толькі ўспамінамі: «Я ж зямліцу меў радную, / Быў свабодзен сам» [4, с. 12].

Без свабоды, падкрэслівалі філаматы, не можа існаваць ніякіх грамадскіх даброт. Варта адзначыць, што катэгорыя свабоды ў межах мастацкай спадчыны А. Міцкевіча насіла не індывідуальны, а грамадскі характар. У аўтарскай інтэрпрэтацыі сацыяльна-палітычны ідэал свабоды ўвасабляе супольную тэндэнцыю змагання за вызваленне. Лірычны герой А. Міцкевіча кажа ад імя людзей, якія падзяляюць яго палітычныя перакананні і апазіцыйна настроеныя ў адносінах да дэспатыі, да расійскага самадзяржаўя і да яго канкрэтна-гістарычнай формы – улады Аляксандра І: «Даво-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лі мне (Мацею. – *У. Ж.*) царовы трутні патачылі / На шыі і ўнутры, праелі скрозь да жылля» [5, с. 188]; « – Вайна! – крычыць (Мацей Дабжыньскі. – *У. Ж.*). – А з кім? Супроць якога краю? / – Супроць цара з ягонай зграяй – маскалямі!» [7, с. 189].

Інтэнцыянальнае канструяванне, якое складае аснову творчасці ідэалу ў межах культуры, найперш праектуе ідэал на ўзроўні падсвядомасці і карэлюе яго з рэальнасцю сацыяльнага быцця. А. Міцкевіч прапануе канкрэтную схему дасягнення свабоды для Айчыны – схему рэалізацыі ідэалу, на які павінны быць скіраваны імкненні грамадства. Дадзеная схема ўяўляе сабой канкрэтна-гістарычны план, паводле якога тагачасная шляхта павінна была падтрымаць у вайне войскі Напалеона, з чыім прыходам звязвалася доўгачаканае вызваленне з-пад імперскай улады: «Што ж самы час, калі нам вольнасць / Напалеон нясе ў Літву…» [7, с. 170]. Увасабленне сацыяльна-палітычнага ідэалу свабоды аўтар бачыць у самастойным змаганні за вызваленне – падрыхтоўцы шляхецкага паўстання супраць расійскіх прыслужнікаў, пра што сведчыць заклік да яднання ў змаганні з ворагам: «Каб вы, ліцвіны, да прыходу войск француза, / Былі гатовыя да братняга саюза / З Каронай і пацвердзілі сваім змаганнем / З агульным ворагам гатоўнасць аб'яднання» [7, с. 172–173].

Адмаўленне ад асабістага на карысць грамадскага даволі часта выступае ў якасці дамінуючай рэфлексіі ў творчасці А. Міцкевіча. Так, у змаганні за ідэал свабоды аўтар прытрымліваецца меркавання, што грамадская супольнасць мусіць згуртавацца і дзейнічаць у адпаведнасці з адзінай праграмай, якая б вызначала паводзіны кожнага ў справе дасягнення агульнай мэты: «Бо каб свабоды ўсім у чарадзе дабіцца, / Павінен кожны з гурту нечым адступіцца / У сваім уласным. Вось вам першая падстава / Для сацыяльнага кантракту!» [7, с. 191].

Так, аўтарская рэфлексія закранае ідэал сацыяльнага аб'яднання, сацыяльнай і этнічнай кансалідацыі як неабходную ўмову ў змаганні за свабоду. Аб'яднанне, кансалідацыя, згуртаванасць у ідэалізаваным успрыманні суб'ектаў беларускай рамантычнай традыцыі разумеецца як сацыяльнае і культурнае адзінства, неабходнае для поўнага асэнсавання праблемы залежнасці ад імперыі і немагчымасці самастойнага палітычнага і культурнага развіцця як на ўзроўні індывідуальнай свядомасці, так і на грамадскім узроўні. У адпаведнасці з гэтым усведамляецца неабходнасць яднання для сумеснай барацьбы супраць агульнага ворага.

Адметнасцю творчага пераасэнсавання ідэалу сацыяльнага аб'яднання можна назваць неабходнасць сацыяльнай кансалідацыі на двух узроўнях: на ўзроўні адносін паміж прадстаўнікамі шляхецкай супольнасці і ўзроўні адносін шляхціц – селянін. Безумоўна, імкненне да яднання з'яўляецца першасным фактарам у барацьбе за аднаўленне дзяржаўнасці, а менавіта Рэчы Паспалітай. Міжусобныя войны, якімі была раз'яднана беларуская шляхта ўжо з XVIII ст., фактычна і прывялі да страты сацыякультурнай і палітычнай незалежнасці. Менавіта таму А. Міцкевіч у паэме «Пан Тадэвуш» вялікую ўвагу надае ідэалу прымірэння і яднання шляхты Сапліцова, Гарэшкаў і Дабжынцаў у змаганні з агульным ворагам. Першапачатковыя шляхецкія войны звязаны пераважна з непераадольным комплексам уласнай значнасці кожнага прадстаўніка шляхецкага саслоўя, а таксама зай-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

здрасцю, пыхай, што засцілі вочы шляхце і ў выніку прымусілі забыцца пра тое, хто з'яўляецца сапраўдным ворагам: «Да таго ж і зайздрасцьненаеда / Тут зеў разявіла ўкусіць свайго суседа, / Бо галадранцы ўсе, Сапліца ж быў багаты» [7, с. 202]. У дадзенай акалічнасці бачыцца адна з характэрных рыс нацыянальнага характару, якая спрадвеку замінае кансалідацыі беларускага грамадства ў моцную нацыянальную супольнасць: калі ў справе ўсеагульнага змагання за нацыянальныя інтарэсы на першы план выходзяць асабістыя амбіцыі, якія ў сваю чаргу не дазваляюць прыйсці да мэты, паколькі ўносяць разлад у агульную справу. А. Міцкевіч, такім чынам, праз адлюстраванне шляхецкай раз'яднанасці спрабуе падкрэсліць важнасць адзінства ў змаганні: «Бяда, што напаткала Дабжынцаў у суддзі, / Сюды на ноч сагнала ўсю шляхту з наваколля < … > / Хоць мелі на Дабжынцаў крыўд і зла нямала, / Цяпер забыліся на ўсё. Іх аб'яднала / Пачуцце роднасці…» [7, с. 237]

За неабходнасць адзінства кшталту кроўнага, сямейнага паміж markрознымі саслоўямі выступае і Я. Чачот. У большасці вершаў паэт заклікае да ўзаемаразумення паміж панамі і сялянамі, напрыклад, у вершы «Дабрачынным панам і іх аканомам, што клапоцяцца пра добры быт сялян»: «Бог, што вам калісь даверыў, / Дбаць пра ўсіх сялян, пра лёс іх, / За дабро надзеліць шчасцем / На зямлі і ў нябёсах» [13, с. 52].

Менавіта на аснове ідэалу сацыяльнага яднання на ўзроўні адносін шляхціц – селянін у творчасці суб'ектаў рамантычнай парадыгмы назіраецца зварот да пераасэнсавання такога дамінуючага з часоў асветніцтва ідэалу, як роўнасць. Калі яднанне ў барацьбе на падставе шляхецкай роўнасці для той эпохі падаецца з'явай агульназразумелай, то прыняцце да ўвагі і прызнанне паўнавартаснага становішча сялян у параўнанні з панамі становяцца надзвычай актуальнымі. Прызнанне сацыяльнай роўнасці служыць адным з першых кансалідуючых фактараў нацыянальнай супольнасці.

Роўнасць як дамінуючы грамадскі ідэал XIX ст. у межах рамантычнай парадыгмы ў асноўным меў не сацыяльную, а маральную аснову – роўнасць у справядлівай адказнасці за правіннасць. «Пан, мешчанін, службовец, / Ці шляхціц, які цёмны іншавер-вясковец, / За знеслаўленне гонару асобы роўны / Нясе адказнасць, і аб гэтым жа даслоўна / Гаворыцца ў статуце, у раздзеле трэцім», – зазначае А. Міцкевіч [7, с. 296].

Ідэя згоды і паразумення між саслоўямі атрымала ўвасабленне ў межах рамантычнай сацыякультурнай парадыгмы. Ідэалізацыя вобраза «добрага пана» са спагадлівымі бацькоўскімі адносінамі да сялян фарміравала патэрналісцкі ідэал, які атрымаў адметнае пераасэнсаванне ў творчасці суб'ектаў культуры. Такі суддзя Сапліца ў паэме «Пан Тадэвуш»: «Ён першы волю даў нам шляхце і сялянам, / І ў пояс кланяцца як перад грозным панам <…> / Клянуся, як на споведзі, не раз я бачыў: / Ён за адным сталом садзіўся з парабкамі, / Ды і з прыгоннымі сваімі – мужыкамі; / Плаціў за маламоцных часцяком падаткі, / А гэта ж не абы-якія там выдаткі!» [7, с. 196].

У сучаснай культуралагічнай думцы Беларусі існуе меркаванне наконт таго, што рэалізацыя грамадскіх ідэалаў магчыма праз ідэалы духоўныя, ідэалы маральныя [11, с. 61]. Вырашэнне многіх сацыяльных праблем



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

В. Каратынскі у межах рамантычнай парадыгмы сацыякультурнага развіцця грамадства бачыць у аднаўленні боскага парадку, у адпаведнасці з якім усе людзі паміж сабой роўныя па кроўнай лучнасці, абумоўленай хрысціянскай сістэмай светапогляду. Менавіта гэтым тлумачыцца спадзяванне паэта на тое, што селяніну «братам стане пан»: пераасэнсаванне грамадскага ідэалу сацыяльнай роўнасці праз хрысціянскі маральны ідэал. Пісьменнік падкрэсліваў узаемаабумоўленасць і знітаванасць грамадскага і маральнага, хрысціянскага ідэалу. Ідэал боскага, гарманічнага светаўладкавання бачыцца паэту наступным чынам: «Мой ідэал – з небам люд аб’яднаны» [4, с. 83], што можна праінтэрпрэтаваць як жыццё чалавека і грамадства паводле боскіх запаведзяў і маральных законаў.

Такім чынам, выяўленыя ў творчай спадчыне суб’ектаў рамантычнай парадыгмы сацыякультурнага развіцця XIX ст. грамадскія ідэалы з’яўляюцца важкімі элементамі светапогляду грамадскай супольнасці. У якасці такіх носьбітаў найвышэйшай каштоўнасці, накіраваных на рэфармаванне тагачаснай далёкай ад дасканаласці сацыякультурнай сітуацыі ў беларускім грамадстве пачатку XIX ст., выступаюць ідэал мінулага, выяўлены ў архетыпе «залатога веку», ідэалы свабоды, сацыяльнага адзінства і роўнасці ўсіх людзей. Дадзеныя ідэалы адлюстроўваюць імкненне суб’ектаў рамантычнай парадыгмы XIX ст., нягледзячы на неспрыяльнасць умоў развіцця і існавання беларускага грамадства, праз мастацтва абудзіць нацыянальны дух і веру народа ў сябе як самастойнага суб’екта – стваральніка высокай духоўнай культуры.

1. *Бадера, Н. И.* Общественный идеал как социальный регулятор и его художественно-эстетические аспекты : автореф. дис. ... канд. филос. наук : 09.00.01 / Н. И. Бадера ; Харьк. гос. ун-т им. А. М. Горького. – Харьков, 1983. – 16 с.

2. *Бакач, Н. Б.* Культурная парадигма как объект социально-философского анализа : автореф. дис. ... канд. филос. наук : 09.00.11 / Н. Б. Бакач ; Волгогр. гос. ун-т. – Волгоград, 1998. – 24 с.

3. *Баршчэўскі, Я.* Выбраныя творы / Я. Баршчэўскі. – Мінск : Беларус. кнігазбор, 1998. – 480 с.

4. *Каратынскі, В.* Творы / В. Каратынскі. – Мінск : Мастац. літ., 2009. – 334 с.

5. *Крукоўскі, М. І.* Бляск і трагедыя ідэалу: філасофскія эцюды пра ідэалы, дэмакратыю і суверэнітэт / М. І. Крукоўскі. – Мінск : Беларус. кнігазбор, 2010. – 292 с.

6. *Кун, Т.* Структура научных революций / Т. Кун. – М. : Прогресс, 1977. – 300 с.

7. *Міцкевіч, А.* Пан Тадэвуш, або Апошні наезд у Літве: шляхецкая гісторыя 1811–1812 гг. у 12-ці кн. вершамі / А. Міцкевіч. – Мінск : Мастац. літ., 1998. – 367 с.

8. *Петроченко, Н. В.* Культурная парадигма как методологическое средство исследования хореографического искусства : автореф. дис. ... д-ра культурологии : 24.00.01 / Н. В. Петроченко ; Кемеров. гос. ун-т культуры и искусств. – Кемерово, 2005. – 23 с.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

9. *Рагуля, А. У.* Зерне характва: культурфіласофскія нататкі / А. У. Рагуля. – Мінск : Выд. В. Хурсік, 2013. – 272 с.
10. *Сыракомля, У.* Выбраныя творы / У. Сыракомля. – Мінск : Беларус. навука, 2011. – 584 с.
11. *Уладыкоўская, Л.* Духоўныя ідэалы ў сучаснай культуры Беларусі і каштоўнасці глабалізму / Л. Уладыкоўская. – Мінск : БДУ, 2009. – 199 с.
12. *Хёйзинга, Й.* Homo Ludens : статьи по истории культуры / Й. Хёйзинга. – М. : Прогресс-Традиция, 1997. – 416 с.
13. *Чачот, Я.* Свіцязь : Выбраныя творы / Я. Чачот. – Мінск : БелЭн, 1999. – 220 с.

*U. ZHYLKO*

**THE DOMINANT SOCIAL IDEALS' EMBODIMENT IN CREATIVE WORK OF THE ROMANTIC PARADIGM SUBJECTS**

*The article is based around one of the most fundamental culturological categories – the category of the ideal. The author focuses his attention on the social ideals of the XIX century as one of the defining ideological orientations of the subjects of the Belarusian romantic paradigm. Through the peculiarities of the Belarusian social and cultural situation of the XIX century the author substantiates the main thrust of social ideals embodied in the literary texts as landmarks and models for the social order's reforming and improving. Through an appeal to review the features of the Belarusian social and cultural situation of the XIX century the author proves the orientation of social ideals as benchmarks and models for reforming and improving of social order embodied in literary texts.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 19.02.2014.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ